




Чараўнік зеленакветкавы

На мінеральных астравах знайшлі прытулак многія віды рэдкіх і вельмі рэдкіх раслін, у тым ліку архідэі. Гэта пылкагалоўнік чырвоны, гайнік цёмна-чырвоны, чараўнік зеленакветкавы і інш. Але асаблівую цікавасць выклікае венерын чаравічак звычайны: тут знаходзіцца адна з самых паўночных кропак арэала архіднага пояса Палесся, дзе расце венерын чаравічак.



Венерын чаравічак



Пылкагалоўнік чырвоны

# Мы – Захавальнікі ТВП "Балота Спораўскае"!



Захавальнікі ТВП з в. Здзітава

## Дзейнічайце разам з намі для захавання прыроды Беларусі!

Калі Вы жывяце каля балота Спораўскае ці маеце магчымасць наведваць яго, Вы можаце стаць Захавальнікам ТВП "Балота Спораўскае" і дапамагчы зберагчы яе для нашчадкаў.

Удзельнічайце ў захаванні ТВП "Балота Спораўскае", паведамляйце пра пагрозы і свае назіранні супрацоўнікам АПБ, заказніка, прыродаахоўных інспекцый.

## Як далучыцца да нас?

**Заходзьце на старонку**

**www.iba.ptushki.org**

**або тэлефануйце:**

**8 (017) 263-06-13, 8 (01643) 2-22-31**

**ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"**

8 (017) 263-06-13, www.ptushki.org
8 (029) 223-06-13, info@ptushki.org
8 (029) 101-68-87 www.vk.com.ptushki
www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus

**Заказнік "Спораўскі"**
г. Бяроза
8 (01643) 2-22-31
rbz_sporovskij@tut.by

Здымкі: М. Верабей, С. Зуёнак, Г. Іванова, В. Лукшыц, А. Мялік, С. Плыткевіч, С. Сідарук, Дз. Якубовіч

Праект DCI-NSAPVD/2012/292081 "Прырода важна для ўсіх. Умацаванне ахоўы прыроды праз развіццё лідэрства і ўдзел мясцовага насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні" рэалізуецца ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. За змест выдання адказвае ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"

ООО «РИФТУР ПРИНТ» Свидетельство о ГРИИРПИ № 1/284 от 09.04.2014 г. Типография УП «Джи энд Ди» Свидетельство о ГРИИРПИ № 2/36 от 13.01.2014 г. Тираж 2000 экз. Заказ 416

Грамадская арганізацыя **"Ахова птушак Бацькаўшчыны"**
www.ptushki.org



Тэрыторыя, важная для птушак

# БАЛОТА СПОРАЎСКАЕ

Праект фінансуецца ЕС



*Вялікі грыцук*

## Што такое ТВП?

Эфектыўным метадам аховы многіх відаў жывёл і раслін з'яўляецца захаванне прыродных тэрыторый, неабходных для іх існавання. Адзін з падыходаў – гэта выдзяленне ў адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі Тэрыторый, важных для птушак (ТВП), якія забяспечваюць выжыванне папуляцый большасці відаў птушак. Гэта месцы гнездавання, зімоўкі ці міграцыйныя шляхі тых відаў птушак, якія маюць неспрыяльны ахоўны статус або знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Сусветная праграма ТВП ахоплівае 200 краін, больш за 12 000 тэрыторый, з якіх 51 знаходзіцца ў Беларусі.

ТВП "Спораўскія балоты" – адзін з буйнейшых у Еўропе комплекс пойменных нізінных балот, якія захаваўся ў натуральным стане.

**Карта Тэрыторый, важных для птушак Беларусі**




## Цікавыя факты пра ТВП "Балота Спораўскае"

**1** Створаны ў 1991 г. заказнік "Спораўскі" – першая тэрыторыя Беларусі, якая ў 1999 атрымала статус Рамсарскага ўгоддзя (водна-балотнай тэрыторыі міжнароднага значэння).



*Вяртлявая чаротаўка*

**2** Адна з найбольш значных тэрыторый для захавання глабальна знікаючага віда – вяртлявай чаротаўкі, дзе гняздуецца 5 % сусветнай папуляцыі гэтай маленькай птушачкі. Вяртлявая чаротаўка селіцца толькі на нізінных балотах, плошча якіх скарачаецца ва ўсім свеце.

**3** Мае нацыянальную значнасць як месца гнездавання дубальта, вялікага грыцука, чорнай рыбачкі, малай чайкі, салаўінага цвыркуна і іншых відаў птушак.



*Чорная рыбачка*



*Салаўіны цвыркун*

**4** Тут сустракаюцца чырванакніжныя рэптыліі: балотная чарапаха і змяя мядзянка.



*Балотная чарапаха*



*Дубальт*

**5** Гэта адзінае буйное балота, якое захавалася ў вадазборы р. Ясельды і мае вялікае значэнне для падтрымання гідралагічнага рэжыму рэгіёна.



*Штогод у жніўні ладзіцца фестываль "Спораўскія сенакосы", дзе кожны жадаючы можа прыняць удзел у розных спаборніцтвах і пакасіць, у тым ліку і дзеля захавання птушак*

## Што пагражае ТВП "Балота Спораўскае"?

- Веснавое, а таксама раннеасенняе выпальванне расліннасці наносіць істотны ўрон біялагічнай разнастайнасці. Разам з травой выпальваецца верхні пласт глебы з карэннямі раслін і гінуць усе насякомыя. На такіх выпаленых балотах і лугах перастае гнездавацца большасць відаў птушак.
- Скарачэнне сенакашэння – асноўная прычына зарастання адкрытых нізінных балот хмызнякамі. У выніку тут перастаюць гнездавацца вяртлявыя чаротаўкі і іншыя птушкі.
- Агульнае паніжэнне ўзроўню вады ў рацэ Ясельда вядзе да высыхання балота з-за недахопу вільгаці.




*Для барацьбы з зарастаннем балота выкарыстоўваецца спецыяльная тэхніка – ратра*